Дзяржаўная ўстанова культуры
«Дрыбінская бібліятэчная сетка»
Цемналеская бібліятэка-філіял

# *Літаратурная Зорка Цемналескай старонкі*



Зборнік метадычных матэрыялаў, прысвечаны памяці Ніны Кавалёвай

Надрукавана на прынтары
Дрыбінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

# Літаратурная Зорка
# Цемналескай старонкі

*Зборнік метадычных матэрыялаў*

Складальнік і дызайн вокладкі: А.М. Шэвардова
Рэдактар: С.І. Верам'ёва

Падпісана да друку 25.11.2021 г. Фармат 60х84 1/6
Бумага афсетная Тыраж 3 экз. Бясплатна

Дзяржаўная ўстанова культуры
"Дрыбінская бібліятэчная сетка"
Цемналеская бібліятэка-філіял
213983 Магілёўская вобл,
в. Цёмны Лес
вул. Школьная, 4
Тэл.: 8-(02248) 70-9-92
E-mail: temniles@lib-dribin.mogilev.by



**Дзяржаўная ўстанова культуры**
**"Дрыбінская бібліятэчная сетка"**
**Цемналеская бібліятэка-філіял**

# Літаратурная Зорка
# Цемналескай старонкі

***Зборнік метадычных матэрыялаў,***
***прысвечаны памяці Ніны Дзмітрыеўны Кавалёвай***

**Цёмны Лес 2021**



На рызыку забыўшы і на страх,
Плыве наш век
Лавінаю сталёвай,
Нам асвятляючы ўдалеч шлях
Сузор'ем песні
Ніны Кавалёвай.

*Васіль Макарэвіч*

**Шэвардова, А.М.** Літаратурная зорка Цемналескай старонкі : зборнік метадычных матэрыялаў, прысвечаны памяці Ніны Дзмітрыеўны Кавалёвай / ДУК "Дрыбінская бібліятэчная сетка"; Цемналеская бібліятэка-філіял ; складальнік і дызайн вокладкі А. М. Шэвардова ; рэдактар С. І. Верам'ёва. – Цёмны Лес, 2021. – 39 с. : іл.



# Для нататак

# Для нататак



## УВОДЗІНЫ

На працягу 2014 — 2021 гадоў асноўная дзейнасць Цемналескай бібліятэкі-філіяла была накіравана на рэалізацыю мэтавых праектаў у рамках краязнаўчых праграмы "Край мой, сэрцу дарагі". У выніку рэалізацыі аднаго з такіх праектаў пры бібліятэцы быў створаны літаратурна-краязнаўчы музейны пакой "Паэтычная зорка маленькай радзімы", прысвечаны жыццю і творчасці знакамітай зямлячкі, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Ніны Дзмітрыеўны Кавалёвай.

Кавалёва Ніна Дзмітрыеўна (28.07.1949 — 16.03.2020) нарадзілася ў в. Еськаўка, Дрыбінскага раёна, Магілёўскай вобласці (Беларусь). Вучылася ў Еськаўскай васьмігодцы, потым у Дрыбінскай сярэдняй школе. Скончыла Аршанскае тэкстыльнае вучылішча (1967). Працавала ткачыхай на Аршанскім ільнокамбінаце. У 21 год цяжка захварэла і вярнулася да бацькоў у родную вёску Еськаўка. У 28 гадоў атрымала 1-ю групу інваліднасці. Больш за 30 гадоў была амаль поўнасцю паралізаваная. З 1986 года жыла ў г. Горкі, Магілёўскай вобласці. Паэтэса. Аўтар 25-ці паэтычных зборнікаў. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі (1997). Лаўрэат літаратурнай прэміі імя Васіля Хомчанкі Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі (2011), суіскальнік Міжнароднай прэміі "Філантроп" (2000). Узнагароджана дыпломам 1-й ступені за лепшую песню аб магілёўскай міліцыі ў намінацыі "Сучасная эстрадная песня" (2008); дыпломам 1-й ступені Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу, прысвечанага 20-годдзю грамадскага аб'яднання "Беларускае таварыства інвалідаў" (2008); дыпломам 1-й ступені Магілёўскага абласнога агляду-конкурсу творчасці інвалідаў (2008), дыпломам другой ступені Магілёўскага абласнога літаратурнага конкурсу, прысвечанага памяці Канстанціна Сіманава, у намінацыі "Паэзія" (2012), дыпломам першай ступені Магілёўскага абласнога літаратурнага конкурсу "Душа в заветной лире", прысвечанага памяці А.С. Пушкіна, у намінацыі "Паэзія" (2013 года); дыпломам 1-ай ступені Міжнароднага літаратурнага конкурсу "Душа в заветной лире" , прысвечанага 215-годдзю з Дня нараджэння А.С. Пушкіна, ў намінацыі "Паэзія" (2014); дыпломам другой ступені Міжнароднага літаратурнага конкурсу, прысвечанага памяці Канстанціна Сіманава, у намінацыі "Паэзія" (2014) і інш. Атрымала за літаратурную дзейнасць больш за 20 ганаровых грамат і дыпломаў.

21 сакавіка 2014 года пры Цемналескай бібліятэцы-філіяле, на малой радзіме паэткі адбылося ўрачыстае адкрыццё літаратурна-краязнаўчага музейнага пакоя "Паэтычная зорка маленькай радзімы". У 2019 годзе Горацкім раённым выканаўчым камітэтам Ніне Кавалёвай прысвоена ганаровае званне "Чалавек года — 2018" ў намінацыі "Грамадска-палітычная дзейнасць". У 2020 годзе Ніна Кавалёва стала лаўрэатам Рэспубліканскага конкурсу "Жанчына года - 2019" ў намінацыі "Актыўная жыццёвая пазіцыя".

Ніна Дзмітрыеўна Кавалёва была членам грамадскага аб'яднання "Беларускае таварыства інвалідаў", грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын" (2018). З 1995 года з'яўлялася членам народнага літаратурнага

аб'яднання “Роднае слова”, якое дзейнічае пры дзяржаўнай установе культуры “Горацкі раённы гісторыка-этнаграфічны музей”, ганаровым членам літаратурнага аматарскага аб'яднання “Вянок Дрыбіншчыны”, створанага пры Дрыбінскай Цэнтральнай раённай бібліятэцы ДУК “Дрыбінская бібліятэчная сетка”, у 2019 годзе была прынята у склад ваенна-гістарычнага клуба “Авіягрупа 122” (г. Масква). Пахавана на грамадскіх могілках ў г. Горкі Магілёўскай вобласці.

Мы павінны беражліва захоўваць памяць аб нашай дарагой зямлячцы і безумоўна перадаваць веды аб Ніне Дзмітрыеўне Кавалёвай нашым нашчадкам. Садзейнічаць папулярызацыі творчасці вядомай паэтэсы сярод розных катэгорый наведвальнікаў бібліятэкі і за яе межамі. На прыкладзе яе жыццёвага подзвігу і літаратурных твораў амаль кожны чалавек зможа навучыцца жыць па запаветах Бога, шанаваць і абараняць сваю Радзіму, любіць людзей і ўвесь навакольны свет, быць добрым і здольным пераадольваць любыя цяжкасці надзённага жыцця.

Зборнік метадычных матэрыялаў прадстаўляе звесткі аб жыцці і творчасці знакамітай зямлячкі Ніны Дзмітрыеўны Кавалёвай, бібліяграфічнае апісанне аўтарскіх зборнікаў паэтэсы і інфармацыйных рэсурсаў, створаных бібліятэкарамі з мэтай папулярызацыі яе творчасці, прадстаўленых ў глабальнай сетцы Інтэрнэт. Выданне дапоўнена прыкладамі сцэнарных матэрыялаў да мерапрыемстваў, дакладаў да навукова-практычных канферэнцый, якія рыхтаваліся бібліятэкарам Цемналескай бібліятэкі-філіяла Аленай Шэвардовай. Сцэнарныя матэрыялы прадстаўлены ў скарочаным варыянце. Бібліяграфія да сцэнарыяў і дакладаў прапануецца ў асобным раздзеле з аднаімённай назвай. Спадзяёмся, выданне будзе карысным бібліятэкарам, краязнаўцам, настаўнікам і іншым аматарам паэтычнага слова нашай зямлячкі.



*Экспазіцыі музейнага пакоя Ніны Кавалёвай “Паэтычная зорка маленькай радзімы”*







# Змест

**1. Уводзіны …………………………………………….………… 5**
**2. Прыклады масавых мерапрыемстваў.………..………… 7**
2.1. Адкрыццё літаратурна-краязнаўчага музейнага пакоя “Паэтычная зорка маленькай радзімы”……………………….…………...7
2.2. Літаратурна-краязнаўчы бібліямарафон “Тут лёс мой, матуля, радзіма мая”…………………………….…………………………………..14
2.3. Буктреллер “Творы Ніны Кавалёвай для дзяцей”……………….……..18
2.4. Літаратурна-музычная кампазіцыя “Паэтычная зорка маленькай радзімы…..……………………………………………………………...…19.
**3. Прыклады дакладаў для канферэнцый.……………. 31**
3.1. Паэтычная зорка маленькай радзімы (работа літаратурна-краязнаўчага музейнага пакоя Ніны Дзмітрыеўны Кавалёвай на базе Цемналескай бібліятэкі-філіяла)……………...……..……………………31
3.2. Наша спадчына (краязнаўчая дзейнасць бібліятэкі ў рамказ мэтавых праектаў)…………………………………………………………..…...33
**4. Бібліяграфія……………………...……..………………... 36**
4.1. Аўтарскія зборнікі……………………………….…………………...36
4.2.Электронныя рэсурсы…………………………………………………..37

области [Электронны рэсурс] : сайт. — Рэжым доступу: http://library.mogilev.by/regionportal/dist-dribin.html — Дата доступу: 14.12.2020.

**Ковалёва Нина Дмитриевна** // Государственное учреждение культуры «Дрибинская библиотечная сеть» [Электронный ресурс] : сайт. — Режим доступа: https://lib-dribin.mogilev.by — Дата доступа: 14.12.2020.

**Кавалёва Ніна Дзмітрыеўна** // Таленты ад роднай зямлі : [Электронны рэсурс] : фактаграфічная літаратурна-краязнаўчая база даных / Учреждение культуры «Могилевская областная библиотека им. В. И. Ленина». — Рэжым доступу: http://catalog.library.mogilev.by/writers/search_result.php?id=149 — Дата доступу: 14.12.2020.

**Шевардова, Е.** Темнолесская библиотека. Елена Шевардова : [veb-страница, где представлены видеоролики, буктрейлеры о жизни и творчестве Н. Д. Ковалёвой] / Государственное учреждение культуры «Дрибинская библиотечная сеть» / Елена Шевардова // YouTube [электронный ресурс] : социальная сеть. – Режим доступа: https://www.youtube.com/channel/UC1RIcDuLtm3dxXRMTaCtNiA – Дата доступа: 14.12.2020.



## ПРЫКЛАДЫ МАСАВЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ

### Адкрыццё літаратурна-краязнаўчага музейнага пакоя “Паэтычная зорка маленькай радзімы”

*Для падлеткаў, моладзі, дарослых*

***Гучыць музыка кампазітара Ганаболева на словы Н.Кавалёвай.***

***Вядучы:*** Добры дзень, паважаныя госці! Мы рады вітаць вас у нашай бібліятэцы. Ужо некалькі год Цемналеская бібліятэка-філіял працуе па мэтавай праграме “Край мой сэрцу дарагі”. У рамках гэтай праграмы неаднаразова ладзіліся мерапрыемствы па збору і папулярызацыі краязнаўчых матэрыялаў аб жыцці і творчасці знакамітай зямлячкі, ураджэнкі в. Еськаўка Дрыбінскага р-на — члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэсы Н.Дз. Кавалёвай. Вынікам плённай працы стала стварэнне ў бібліятэцы музейнага пакоя “Паэтычная зорка маленькай радзімы”, на ўрачыстым адкрыцці якога, мы з вамі прысутнічаем.

Аб Ніне Кавалёвай ніколі не забывалі на яе маленькай радзіме. Бібліятэкары займаліся зборам і захаваннем інфармацыі аб яе жыцці і творчасці. Вучні і настаўнікі Цемналескай школы даследвалі творчасць і працавалі над афармленнем матэрыялаў. Пры Дрыбінскай раённай бібліятэцы дзейнічае клуб творчых сустрэч “Вянок Дрыбіншчыны”. Ніна Дзмітрыеўна — ганаровы член гэтага клуба з самага пачатку яго дзейнасці. У рамках работы аб’яднання не аднойчы праводзіліся творчыя сустрэчы, прысвечаныя знакамітай зямлячцы. Слова для выступлення прадастаўляецца кіраўніку клуба творчых сустрэч “Вянок Дрыбіншчыны”, дырэктару ДУК “Дрыбінская бібліятэчная сетка” Салтанавай Тамары Сяргееўне.

***Выступленне Т.С. Салтанавай.***

***Вядучы:*** Дзякуй вам, Тамара Сяргееўна. А зараз некалькі слоў аб гісторыі ўзнікнення ідэі стварэння музейнага пакоя нам паведае бібліятэкар Цемналеская б/ф – Алена Міхайлаўна Шавардова.

***Бібліятэкар Цемналескай б/ф:*** Я таксама нарадзілася ў вёсцы Еськаўка, Дрыбінскага раёна. Разам з сяброўкамі часта бывала ў Ніны Дзмітрыеўны дома. Нібы нейкая неверагодная сіла прыцягвала нас падлеткаў да паэтэсы. Цяпер я ведаю, што гэта сіла — яе творчасць і добразычлівыя адносіны да навакольнага свету і людзей, асабліва дзяцей. Пэўна таму нам хацелася быць падобнымі на Ніну Кавалёву і разам з іншымі дзяўчатамі я спрабавала пісаць вершы. Але ішлі гады. Ніна Дзмітрыеўна пераехала жыць ў г. Горкі. Мне часам даводзілася бываць у зямлячкі ў гасцях. Тады яшчэ я знаёмілася з творчасцю Ніны Дзмітрыеўны ў якасці звычайнага чытача. Многія зборнікі набывала для сябе. Больш глыбока захапілася літаратурным словам знакамітай зямлячкі ўжо калі пачала працаваць бібліятэкарам. Першая наша рабочая сустрэча адбылася падчас творчай вечарыны, прысвечанай 60-годдзю з дня нараджэння Ніны Дзмітрыеўны. Мяне прыемна здзівіла багатая літаратурная спадчына вершаў і песень, ўразіла сіла яе душы. У той момант я вырашыла сабраць у бібліятэцы

як мага больш інфармацыі аб знакамітай зямлячцы, але прызнацца не магла ўявіць для сябе яе памераў. Па выніках работы бібліятэкі ў гэтым накірунку, на пачатак 2013 года было відаць, што накопленыя матэрыялы могуць стаць асновай для стварэння музейнага пакоя аб жыцці і творчасці Ніны Кавалёвай. Менавіта таму і было прынята рашэнне аб пачатку работы па стварэнню музейнага пакоя. І вось музейны пакой створаны і чакае сваіх першых наведвальнікаў.

***Вядучы:*** Паважаныя сябры! Набліжаецца ганаровы момант нашай сустрэчы! Калі ў Ніны Дзмітрыеўны спыталіся: “Хто павінен перарэзаць чырвоную ленту на ўваходзе ў музейны пакой?”. — Яна, не думаючы, адказала: “Аб чым гутарка? Той, хто яго стварыў”. — “А хто дапамагаў?” — “Павінен дапамагчы гэта зрабіць”. Права адчыніць музейны пакой “Паэтычная зорка маленькай радзімы”, для ўсіх наведвальнікаў бібліятэкі, прадастаўляецца бібліятэкару Цемналескай бібліятэкі-філіяла Шэвардовай Алене Міхайлаўне, а мы дапаможам ёй у гэтай адказнай справе.

***Бібліятэкар разам з начальнікам аддзела ідэалагічнай работы культуры і па справах моладзі А.М. Рэбкавец пераразае чырвоную ленту.***

***Бібліятэкар Цемналескай б/ф:*** А зараз запрашаем вас, паважаныя госці, стаць першымі наведвальнікамі музейнага пакоя “Паэтычная зорка маленькай радзімы”.

***Пачынаецца экскурсія па музейныі пакоі.***

Паважаныя сябры! Мы ганарымся тым, што маем з Нінай Дзмітрыеўнай агульныя карані і спадзяёмся, што зможам захаваць і перадаць літаратурную спадчыну знакамітай зямлячкі нашым нашчадкам. Я і мае землякі вельмі ўдзячны Ніне Дзмітрыеўне за непаўторную прыгажосць яе літаратурнага слова, любоў да сваёй маленькай радзімы. Першае прызнанне сваёй творчасці Ніна Кавалёва атрымала ад усіх землякоў у прыгожых радках верша жыхара в. Цёмны Лес Уладзіміра Багамазава.

Як не здзіўляцца
гэтай вось душы
І сэрца чалавечнасці бясконцай?
Пішы і далей, родная пішы!
Пра мір, зямлю, пра хмары
І пра сонца.
…З акна – прастор
Кругом лясы, палі
І не сядзіцца ў цемры пакаёвай…
Паклон табе. Да самай да зямлі,
Мая зямлячка,
Ніна Кавалёва.

На жаль сама паэтэса па стану здароў’я не можа прысутнічаць на святочным мерапрыемстве, але спадзяюся, знаёмства з экспанатамі музейнага пакоя, дазволіць усім нам адчуць сілу і талент паэтычнага слова Ніны Кавалёвай, незвычайную чысціню і прыгажосць яе душы. Яна не скардзіцца на



Спірыдона Собаля. — 2004. — 68 с.
10. Ковалёва, Н. Д. Божья заповедь : стихи для детей / Нина Дмитриевна Ковалèва. — Могилèв : Могилèво-Мстиславская епархия, 2005. — 74 с.: ил.11.
11. Ковалèва, Н. Васильковая кадриль : стихи для юношества / Нина Ковалèва. — Горки : Печатник, 2006. — 127 с.: ил.
12. Кавалèва, Н. Д. Як рыбка з вадою : вершы / Н. Кавалèва ; [мастак О. Л. Котава]. — Горкі : Печатник, 2007. — 135 с.
13. Ковалèва, Н. Д. Нарисуем всè про нас : стихи для детей / Нина Ковалèва. — Горки, 2007. — [12 л.: ил.].
14. Кавалèва, Н. Кветкі Багародзіцы : [вершы] / Ніна Кавалèва. — Горкі : Печатник, 2008. — 63 с.
15. Кавалèва, Н. Са скрыпачкай ды з дудой : народныя песні, прыпеўкі, абрады / Ніна Кавалева. — Горкі : Печатник, 2009. — 190, [1] с.
16. Ковалева, Н. Строится храм : [стихи] / Нина Ковалева. — Минск : Белпринт, 2010. — 119, [1] с.
17. Кавалèва, Н. Лодка кахання : [вершы] / Ніна Кавалèва. — Мінск : Белпрынт, 2011. — 111 с.
18. Кавалèва, Н. Голас вякоў : [зборнік вершаў] / Ніна Кавалèва. — Мінск : Белпринт, 2013. — 141 с.
19. Ковалèва, Н. Двери милосердия : [стихи, рассказы, сказка] / Нина Ковалèва. — Минск : Белпринт, 2014. — 147 с.
20. Ковалèва, Н. Мы стали обелисками : 70-летию Великой Победы посвящается… / Нина Ковалèва ; ГУК «Горецкий районный историкоэтнографический музей», Народное литературное объединение «Роднае слова». — Минск : Белпринт, 2015. — 80, [1] с.: ил.
21. Ковалèва, Н. Голубая криница : стихи и рассказы ; ГУК «Горецкий районный историко-этнографический музей», Народное литературное объединение «Роднае слова». — Минск : Белпринт, 2016. — 95 с.
22. Ковалёва, Н. Ангел над колыбелью : стихи / Нина Ковалёва. — Минск : Белпринт, 2017. — 35 с. : ил.
23. Ковалёва, Н. Я шагаю по земле : стихи / Нина Ковалёва. — Минск : Белпринт, 2017. — 35 с. : ил.
24. Кавалёва, Н. Як купалі ў купелі : [вершы і інш.] / Ніна Кавалёва. — Мінск : Белпринт, 2018. — 237 с. : ил.
25. Ковалёва, Н. На перекрёстке родины и жизни / Нина Ковалёва. — Минск : Белпринт, 2020. — 116 с. : ил.

**Электронныя рэсурсы**

**Зорка таленту Ніны Кавалёвай** : [паўнатэкставая літаратурна-краязнаўчая база дадзеных, прысвечаная жыццю і творчасці Н. Дз. Кавалёвай] // Государственное учреждение культуры «Дрибинская библиотечная сеть» [электронный ресурс]. – Рэжым доступа: https://sites.google.com/view/lib-dribin-nina-kovaleva-basa/галоўная – Дата доступа: 06.07. 2020.
**Зорка таленту Ніны Кавалёвай** // Краеведческий портал Могилёвской

***Слайд 18.*** За папулярызацыю чытання, беларускай культуры і літаратуры, выхаванне падрастаючага пакалення, удзел у раённых аглядах-конкурсах, укараненне ў практыку інфармацыйных тэхналогій і іншыя дасягненні дзейнасць бібліятэкі адзначана кіраўніцтвам раёна і аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Дрыбінскага раённага выканаўчага камітэта ганаровымі дыпломамі, граматамі і падзякамі.

***Слайд 19.*** У будучым бібліятэка плануе працаваць над рэалізацыяй новых мэтавых краязнаўчых праектаў, накіраваных на захаванне і памнажэнне гісторыка-культурнай спадчыны рэгіёна.

***Слайд 20.*** Надаваць шмат увагі патрыятычнаму выхаванню падрастаючага пакалення, вывучэнню і даследванню падзей Вялікай Айчынай вайны на тэрыторыі раёна. З гэтай нагоды Алена Шэвардова і члены аматарскага аб'яднання "Спадчына" ўжо наладзілі супрацоўніцтва з іншымі краязнаўцамі, жыхарамі вёскі, прадстаўнікамі дзяржаўных органаў кіравання.

***Слайд 21.*** Творчасць і жыццёвы подзвіг знакамітай зямлячкі Н.Дз. Кавалёвай як прыклад таленту, асабістай мужнасці і бязмежнай пашаны да сваёй маленькай радзімы, безумоўна, адыгрывае важную ролю ў выхаванні дзяцей, падлеткаў і моладзі, захаванні культурнай спадчыны краіны.

***Слайд 22.*** Таму работа літаратурна-краязнаўчага музейнага пакоя Н.Дз. Кавалёвай "Паэтычная зорка маленькай радзімы" застаецца найбольш важным накірункам у краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі і эфектыўны формай папулярызацыі ведаў аб жыцці і творчасці знакамітай зямлячкі.

## БІБЛІЯГРАФІЯ

### Аўтарскія зборнікі


1. Ковалѐва, Н. Напиток певчих птиц : стихи / Нина Ковалѐва. — Горки, 1993. — 53 с.
2. Ковалѐва, Н. Д. Вода — чудесница : стихи для детей / Нина Ковалѐва ; [редактор В. М. Лившиц ; художник Т. Титюркина]. — Горки : Отдел культуры Горецкого райисполкома, 1994. — 24 с.
3. Ковалѐва, Н. Черемуховый лес : стихи / Нина Ковалѐва. — Горки : Отдел культуры Горецкого райисполкома, 1995. — 51 с.
4. Ковалева, Н. Отдайте ближнему долги : стихи / Нина Ковалева. — Горки : Отдел культуры Горецкого райисполкома, 1996. — 72, [1] с.
5. Ковалѐва, Н. Д. Есть у дождика подружка : стихи для детей / Нина Ковалѐва ; [редактор В. М. Лившиц ; художник Т. Титюркина]. — Минск : Красико-Принт, 1998. — 71 с.
6. Ковалева, Н. Д. Ликующий полет : стихи / Нина Ковалева. — Минск : Мастацкая літаратура, 1999. — 174, [1] с.
7. Ковалева, Н. Моей души колокола : стихи / Нина Ковалева. — Горки : Отдел культуры Горецкого райисполкома, 2000. — 39 с. 8. Ковалева, Н. Зов любви : стихи / Нина Ковалева. — Горки : Отдел культуры Горецкого райисполкома, 2003. — 123 с.
9. Кавалѐва, Н. Д. Хто галоўны на сяле : вершы / Ніна Кавалѐва ; [худ. А. Я. Бруй, А. С. Шаўцоў]. — Магілѐў : Магілѐўская абласная друкарня ім.




свой лёс і лічыць, што ўсе выпрабаванні дадзены чалавеку Богам не выпадкова.

"…Судьба счастливая моя!
Дана твоею властью,
На жизнь обиды не тая,
Воспеть чужое счастье."

Першыя экспанаты нашага пакоя (копія пасведчання нараджэння, пашпарта) сведчаць аб нараджэнні вясковай дзяўчынкі 28 ліпеня 1949 года ў вёсцы Еськаўка Дрыбінскага раёна. Як потым напіша сама паэтэса: дзяўчынка "атрымала" благаславенне ў жыццё ад самой маці прыроды, сваёй роднай старонкі.

"Абвясціла ліпеньскае ранне
Нараджэнне гэтае дзяўчынкі
І сваё даслала віншаванне
Бляскам дыяментавай расінкі…"

Фатаграфіі з асабістага архіву ў драўляных рамках, перададзеныя яшчэ ў 2010 годзе, сведчаць аб пэўных фактах жыцця вядомай паэтэсы. У першай рамцы змешчаны фотаздымкі сям'і Ніны Кавалёвай.

Такія экспанаты як самаробная этажэрка, саматканая коўдра, вышываная карціна і сувенір "Масква" і керасінавы ліхтар даюць уяўленене аб жыцці вясковых жыхароў пасляваеннага часу. Многія былі перададзены ў бібліятэку самой паэтэсай. Вось напрыклад верацяно, якім карысталася яшчэ бабуля паэткі і прасціна, якую маці паэтэсы вышывала калі яны былі ў Данбасе.

Як і ўсе вясковыя дзеці Ніна Кавалёва скончыла Еськаўскую васьмігадовую школу. Класным кіраўнікой у яе была Мурашкіна Антаніна Сямёнаўна. Аб вучобе ў школе даюць уяўленне такія рэчы, як чарнільніца і пяро, а таксама фотаздымкі у наступнай рамцы. Пад рамкай размяшчаецца копія пасведчання аб заканчэнні Еськаўскай васьмігодкі. Па успамінах Мурашкінай Антаніны Сямёнаўны, Ніна Кавалёва вучылася добра, актыўна ўдзельнічала ў грамадскім жыцці школы, але ў той час вершаў яна не пісала.

Потым была вучоба у Дрыбінскай сярэдняй школе. Гэтаму часу паэтка прысвяціла верш "Дрибин", перад якім напісала такія словы: "Памяти Минченко А.П., бывшего учителя литературы Дрибинской СШ". Літаратура для дзяўчыны была любімым школьным прадметам.

"…Не звёздный покоритель
И не артист кино,
Мой Дрибинский учитель,
Вы снитесь мне давно.

Наглядные уроки,
Что вы давали нам,
Несли через пороги,
С пути сметали хлам…"

Распіска аб здачы дакументаў у Аршанскае тэкстыльнае вучылішча,

копія дыплома і прафсаюзны білет разказваюць аб новай старонцы жыцця Ніны Кавалёвай, атрыманні прафесіі ткачыхі. Шпулькі з ніткамі яна прывезла да дому з Аршанскага ільнокамбіната, дзе працавала пасля заканчэння вучылішча ткачыхай. Вось яна на фота з бацькам у горадзе Оршы.

Але нечаканая хвароба перакрэслівае жыццёвыя планы маладой дзяўчыны. І яна вымушана вярнуцца ў вёску Еськаўка, атрымаўшы першую групу інваліднасці. Фатаграфіі ў рамцы расказваюць аб жыцці дзяўчыны ў роднай вёсцы.

“…Не ответит ни сердце ни разум,
Почему эти взгорки люблю.
И поётся и плачется разом,
Лишь на землю родную ступлю.”

Маладую дзяўчыну чакалі цяжкія выпрабаванні. Паралізацыя пачалася з рук і паступова рабіла ўсё больш нерухомым яе цела. Медыцына не давала рады. Страціўшы магчымасць самастойна рухацца, Ніна Кавалёва ўзамен атрымлівае нешта новае, пакуль што не зразумелае самой дзяўчыне. У 28 гадоў піша свае першыя вершы і адсылае іх у газету “Савецкая Беларусія”. Яе талент заўважае журналіст Раман Аляксеевіч Ярохін. На працягу ўсяго свайго жыцця не губляе сувязі з паэтэсай і дапамагае ёй. Вось і ксеракопія публікацыі вершаў з газеты “Савецкая Беларусія” з артыкулам Рамана Ярохіна. У 2005 годзе Раман Ярохін апублікуе сваю кнігу “Интонация вздоха”, у якой побач са знакамітымі імёнамі свету мы з гонарам можам прачытаць імя нашай таленавітай зямлячкі. На 50 старонках змешчана амаль ўся перапіска творцаў, па якой можна прасачыць многія факты жыцця паэтэсы і вядомага журналіста. І ў гэтай частцы пакоя мы паспрабавалі стварыць імправізаванае рабочае месца пачынаючай паэтэсы. Калі яе рукі ўжо не маглі трымаць аловак і шарыкавую ручку, бацька за вядро мёду купляе для дачкі друкарскую машынку. Яна стукала па клавішах машынкі вось гэтым алоўкам, а побач з машынкай знаходзіцца рабочая папка паэтэсы з машынапіснымі тэкстамі. Былі публікацыі у многіх сродках масавай інфармацыі. Да паэтэсы прыходзілі школьнікі, аднавяскоўцы. Прыязжала рэспубліканскае тэлебачанне. У той час быў зняты відэафільм “Эхо доброты”. На жаль ад гэтага відэафільма застаўся маленькі кавалачак плёнкі і фотаздымак. У архіве на тэлебачанні здарыўся пажар і большая частка відэаплёнкі была знішчана. Але засталіся яшчэ ўспаміны сведкаў-дзяцей, якія прымалі ўдзел у здымках фільма. Да гэтых дакументаў мы вернемся пазней.

У 1986 годзе пабачыў свет першы калектыўны зборнік для дзяцей “Петя Зяблик и его кораблик”. Пасля гэтага сям’я Кавалёвых пераязджае жыць ў Горкі Магілёўскай вобласці. Але ў думках і марах паэтэса не аднойчы вяртаецца на сваю маленькую радзіму і прысвячае ёй прыгожыя вершы і песні. Некаторыя з іх размешчаны ў рамках на сцяне нашага пакоя. Непаўторныя назвы вёсак Цемналескай акругі, яе жыхары назаўсёды застануцца жывымі ў памяці нашых нашчадкаў, дзякуючы творам Ніны Кавалёвай.

Наступная частка музейнага пакоя прысвечана літаратурнай спадчыне паэтэсы. Яна налічвае 18 асабістых і больш за 5 калектыўных зборнікаў,



***Слайд 10.*** Так, у 2016 годзе бібліятэкар разам з падлеткамі клуба “Спадчына” заснавалі канал “Темнолесская библиотека. Елена Шевардова” на інфармацыйным рэсурсе YouTube. Дзе ўвазе наведвальнікаў і падпісчыкаў прапануюцца літаратурна-пазнавальныя відэаролікі, буктрейлеры па кнігах Ніны Кавалёвай і інш. матэрыялы. У 2020 годзе на гэтым канале праводзілася акцыя памяці “Нина Ковалёва. Книга-онлайн”.

***Слайд 11.*** З мэтай папулярызацыі творчасці знакамітай зямлячкі выкарыстоўваюцца і іншыя інфармацыйныя рэсурсы. На сайтах ДУК “Дрыбінская бібліятэчная сетка” і УК “Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна” размешчана база дадзеных “Зорка таленту Ніны Кавалёвай” аб жыцці і творчасці паэткі. Распрацаваныя краязнаўчыя электронныя рэсурсы выкарыстоўваюцца ў прафесійнай дзейнасці бібліятэкарамі, педагогамі і даследчыкамі творчасці нашай зямлячкі.

***Слайд 12.*** Краязнаўчая работа бібліятэкі ў гэтым накірунку прываблівае ўвагу спецыялістаў бібліятэчнай справы і адукацыі. У 2016 годзе бібліятэка прымала ўдзел у навукова-практычнай канферэнцыі “Пысінскія чытанні”, якая праводзілася УК “Магілёўская абласная бібліятэка імя. У.І. Леніна”, краязнаўчай канферэнцыі “Бацькаўшчына” на базе кафедры гісторыі і педагогікі УА “БДСГА”.

***Слайд 13.*** Разам з членамі аматарскага аб’яднання “Спадчына” і калегамі-бібліятэкарамі ў 2019 годзе прадстаўляла краязнаўчую выставу-экспазіцыю “Дрыбін! Ведай наша!” на рэгіянальным фестывалі паэзіі і аўтарскай песні “Пісьмянкоў луг”. Работа бібліятэчнай сеткі па прадстаўленню краязнаўчых матэрыялаў ў рамках фестывалю была адзначана дыпломам трэццяй ступені.

***Слайд 14.*** У складзе дэлегацыі ад Дрыбінскага раёна бібліятэка ўдзельнічала ў святкаванні XXVII Дня беларускага пісьменства. Увазе наведвальнікаў свята бібліятэкарамі прапанавалася выстава-экспазіцыя па творчасці Н.Дз. Кавалёвай “Паэзія — яе жыццё”. Ля выставы ладзіліся гучнае чытанне, гутаркі аб жыцці і творчасці паэткі, агляд экспазіцыі.

***Слайд 15.*** Амаль штогод бібліятэка прымала ўдзел у правядзенні рэгіянальнага фестывалю народнай творчасці, народных промыслаў і рамёстваў “Дрыбінскія таржкі” (2012, 2014, 2015, 2019 гг.). Дзе прадстаўляла творчасць таленавітых ураджэнцаў Цемналескай акругі.

***Слайд 16.*** У 2016 годзе Цемнолесская бібліятэка-філіял прымала ўдзел ў рэспубліканскім конкурсе “Лепшая бібліятэка года”, а ў 2020 годзе ў абласным аглядзе-конкурсе сярод публічных бібліятэк па стварэнню паўнатэкставых краязнаўчых баз дадзеных “Малая радзіма — вялікая любоў”.

***Слайд 17.*** За праект літаратурна-краязнаўчага музейнага пакоя Ніны Дзмітрыеўны Кавалёвай “Паэтычны зорка маленькай Радзімы” ў XXII рэспубліканскім конкурсе “Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры” бібліятэка-філіял атрымала дыплом 2-й ступені ў намінацыі “Інавацыі ў бібліятэчнай справе”. У абласным аглядзе-конкурсе “Талент ад роднай зямлі” на лепшую пастаноўку работы бібліятэк у галіне літаратурнага краязнаўства дзейнасць бібліятэкара была адзначана дыпломам “За высокі прафесіяналізм”.

***Ніна Кавалёва***

***Слайд 2.*** У самым пачатку сваёй прафесійнай дзейнасці я захапілася вывучэннем гісторыка-культурнай спадчыны краю і асноўным напрамкам у рабоце вызначыла літаратурнае краязнаўства.

***Слайд 3.*** Творчая сувязь бібліятэкара з таленавітай зямлячкай-ураджэнкай в. Еськовка Дрыбінскага раёна, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі Нінай Дзмітрыеўнай Кавалёвай і кіраўніком народнага літаратурнага аб'яднання “Роднае слова” (ДУК “Горацкі раённы гісторыка-этнаграфічны музей”) Людмілай Мікалаеўнай Дзеружковай спрыяла паспяховай рэалізацыі многіх краязнаўчых праектаў, запланаваных у рамках мэтавай праграмы “Край мой сэрцу дарагі”.

***Слайд 4.*** Бібліятэка заўсёды актыўна ўдзельнічае ў розных мерапрыемствах па папулярызацыі творчасці землякоў Ніны Кавалёвай, Святланы Цярэшка, Святланы Ластачкінай, якія сістэматычна ладзяцца ў рамках работы літаратурнага аб’яднання. Яна займаецца зборам біяграфічных звестак аб таленавітых ураджэнцах Цемналескай акругі, набывае літаратурныя зборнікі і іншыя матэрыялы для краязнаўчага фонду.

***Слайд 5.*** З 2012 года пры бібліятэцы працуе аматарскае аб’яднанне “Спадчына”. Навукова-даследчая дзейнасць юных краязнаўцаў-членаў аб’яднання амаль штогод адзначаецца дыпломамі на раённым, абласным і рэспубліканскім узроўнях у сферах адукацыі і культуры.

У 2013 годзе разам з бібліятэкарам дзеці і падлеткі актыўна працавалі над стварэннем літаратурна-краязнаўчага музейнага пакоя Ніны Дзмітрыеўны Кавалёвай “Паэтычны зорка маленькай Радзімы”.

***Слайд 6.*** Адкрыццё 21 сакавіка 2014 года на базе Цемналескай бібліятэкі-філіяла музейнага пакоя, прысвечанага жыццю і творчасці паэткі-зямлячкі, на дадзены момант — адзіны, унікальны вопыт у рабоце публічных бібліятэк Магілёўшчыны.

***Слайд 7.*** Экспанаты і дзейнасць музейнай пакоя прыцягваюць увагу землякоў і прыхільнікаў творчасці Ніны Кавалёвай з розных рэгіёнаў Беларусі і замежных краін. Менавіта таму, на базе бібліятэкі-філіяла праходзілі раённыя (2015, 2016 гг.), міжраённы (2015 г.), абласны (2016), рэспубліканскі (2017 г.) семінары.

***Слайд 8.*** Да ўвагі спецыялістаў рэспубліканскага семінара “Сучасны стан і вектары развіцця бібліятэк Рэспублікі Беларусь”, які праводзіўся з удзелам супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі і Міністэрства Культуры Беларусі, прапанавалася экскурсія-знаёмства з экспанатамі музейнай пакоя, работа бібліобуса, творчая справаздача аб напрамках дзейнасці бібліятэкі ў сучасным грамадстве.

***Слайд 9.*** У 2020 годзе ў фонд музейнага пакоя былі перададзены кнігі, асабістыя дакументы і рэчы знакамітай зямлячкі. З выкарыстаннем каштоўных экспанатаў музейнага пакоя сістэматычна праводзяцца масавыя мерапрыемствы для розных катэгорый наведвальнікаў, ствараюцца новыя і ўдасканальваюцца ўжо створаныя электронныя рэсурсы.



публікацыі ў сродках масавай інфармацыі. На стэлажы ўсе дакументы размешчаны ў адваротна-храналагічным парадку іх выхаду ў свет.

Творчасць Ніны Кавалёвай ўсебакова ахоплівае надзённыя тэмы нашага жыцця. Амаль з самага пачатку сваёй літаратурнай дзейнасці Ніна Кавалёва пачынае пісаць для дзяцей.

***Гучаць вершы паэтэсы для дзяцей.***

Апошнім часам скарбонка творчасці для дзяцей была дапоўнена паэтэсай новымі жанрамі — гэта інсцэніроўкі і казкі ў вершах. Машынапісны варыянт некаторых з іх змешчаны ў тэматычнай папцы-дас’е “Неапублікаваныя матэрыялы”.

Як і большасць маладых дзяўчат, Ніна Кавалёва марыла пра сапраўднае каханне. Выйшла замуж. Але яркі, шчаслівы малюнак яе жыцця хвароба хутка зрабіла чорна-белым.

**Роздум.**

Ты кажаш: “У каханне
Кідацца з галавою
Не думай, што растанне
Пагрожвае бядою”.

Змагу я пакахаці?
У бядзе не адвярнуцца.
Змагу я ўтрымаці,
Ці рукі разамкнуцца?

На радасць ці на згубу
Так сэрца палымнее,
Бо можа стацца – любы
І плаваць не умее.

Ты кажаш: “У каханне
Кідацца з галавою”,
А як надыдзе ранне,
Усё залье зарою.

Самай яркай зорачкай у творчасці Ніны Кавалёвай па праву можна лічыць тэму маленькай радзімы. Яна праходзіць чырвонай ніткаю праз розныя жанры творчасці паэтэсы. Так здарылася, што ў Ніны Кавалёвай дзве родныя старонкі. Спрачацца аб першынстве той ці другой немагчыма. Кожную з іх паэтка паважае і шануе аднолькава, але яркія фарбы дзяцінства, прыгожыя мясціны, землякі першай маленькай радзімы далі аснову яе творам, дапамаглі ўбачыць свет вачамі паэта. І да гэтага часу мілыя сэрцу вобразы нараджаюцца ў прыгожыя радкі вершаў і песень, частушак, абрадаў, інсцэніровак у вершах.

***Вершы пра родную вёску Еськаўка.***

Пры актыўнай падтрымцы Рамана Ярохіна, сваіх новых землякоў, талент Ніны Дзмітрыеўны набывае якасці каштоўнага дыямента. І паэтка з удзячнасцю

присвячае вялікую колькасць вершаў і песень роднай Горацкай старонцы.

***Верш "Горкі".***

Паміж работнікамі культуры Дрыбінскага і Горацкага раёнаў падтрымліваюцца творчыя добрасуседскія ўзаемаадносіны. Дзякуючы супрацоўніцтву бібліятэкараў з калегамі ДУК "Горацкая бібліятэчная сетка" і ДУК "Горацкі гісторыка-этнаграфічны музей", у прыватнасці з кіраўніком народнага літаратурнага аб'яднання "Роднае слова" Дзеружковай Людмілай Мікалаеўнай, краязнаўчы фонд бібліятэкі быў папоўнены ксеракопіямі нот песень на словы Ніны Кавалёвай, відэафільмам аб жыцці і творчасці "Паэзія — яе жыццё".

Значная частка творчасці Ніны Кавалёвай прысвячаецца ўзаемаадносінам паміж людзьмі, чалавека да навакольнага свету. ***(Агляд зборнікаў).*** Паэтэса ўпэўнена, што толькі любоў і дабро зможа выратаваць свет і чалавека.

***Верш "Дождик на серебряные нити..."***

Толькі сапраўдная вера ў Бога дапаможа кожнаму з нас знайсці свой шлях да вечнага жыцця. Яна верыць і вера дапамагае ёй пераадольваць цяжкасці, дае натхненне на творчасць.

**Моё добро**

Я в храм иду с поникшими руками,
Сильна и беззащитна пред судьбой.
Моё добро спасу не кулаками –
Пред светлым ликом чистою мольбой.

Забьётся сердце с лёгкостью крылатой —
Его считаю истинным добром.
Его несу я, чистое как злато,
Что много раз испытано огнём.

Тэме Бога прысвечана і наступная частка нашага музейнага пакоя, у якой змешчаны асабістыя рэчы паэтэсы, перададзеныя ў бібліятэку Нінай Дзмітрыеўнай у сакавіку 2014 года.

Далей размешчаны вершы-прысвячэнні Ніне Кавалёвай ад калег па пяру. Яны даюць пэўную характарыстыку творчасці знакамітай зямлячкі.

***Чытаць вершы.***

На наступным стэлажы прапанаваны дакументы, прадметы, якія маюць адносіны да розных падзей жыцця паэтэсы, сведчасць аб значнасці яе творчасці.

***Агляд экспанатаў.***

На сцяне размешчаны асабістыя рэчы Ніны Кавалёвай — прадметы яе адзення.

З копіямі і арыгіналамі дакументаў, фотаздымкамі, якія мы не змаглі размясціць паасобку, зацікаўлены наведвальнік мае магчымасць пазнаёміцца, гартаючы старонкі тэматычных папак-дас'е ***(агляд папак)***. Амаль ўсе матэрыялы з папяровых носьбітаў інфармацыі ацыфраваны і захоўваюцца ў электроннай БД "Радзімы вялікай няма без малой" у асобных раздзелах.



Работа Цемналескай бібліятэкі-філіяла па стварэнню літаратурна-краязнаўчага музейнага пакоя "Паэтычная зорка маленькай радзімы" атрымала 2-е месца на ХХІІ Рэспубліканскім конкурсе "Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры" ў намінацыі "За навацыі ў бібліятэчнай справе". Дзейнасць літаратурна-краязнаўчага музейнага пакоя пры сельскай бібліятэцы — унікальны, пакуль што адзіны вопыт папулярызацыі літаратурнай творчасці на тэрыторыі Магілёўскай вобласці. З моманту адкрыцця музейнага пакоя бібліятэка працуе па мэтаваму праекту, які так і называецца "Паэтычная зорка маленькай радзімы". Найбольш частыя госці музейнага пакоя – вучні і настаўнікі ДУА "Цемналескі ВПК яслі-сад-базавая школа" і пастаянныя наведвальнікі бібліятэкі-філіяла. У апошнія гады на базе музейнага пакоя праводзіліся экскурсіі для калег-бібліятэкараў Чавускай і Дрыбінскай бібліятэчных сетак. У 2016 годзе ў рамках мерапрыемстваў да Году культуры былі арганізаваны экскурсіі: для работнікаў аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Дрыбінскага райвыканкама; удзельнікаў абласнога семінара "Этнаграфічная пляцоўка"; вучняў і настаўнікаў ДУА "Горацкая сярэдняя школа № 4" і ДУДА "Дрыбінскі цэнтр дзіцячай творчасці. Супрацоўніцтва з Н. Дз.Кавалѐвай калегамі ДУК "Горацкі гісторыка-этнагарафічны музей", кіраўніком народнага аб'яднання "Роднае слова" Л.М. Дзеружковай садзейнічае папаўненню фонда музейнага пакоя новымі экспанатамі. Зараз унікальная калекцыя налічвае больш за 1000 экспанатаў. Падчас правядзення масавых мерапрыемстваў яго наведалі 850 чалавек. Кожны жадаючы мае магчымасць пазнаѐміцца з работай літаратурна-краязнаўчага музейнага пакоя, наведаўшы сайт ДУК "Дрыбінская бібліятэчная сетка", дзе размешчана асабістая старонка Ніны Кавалѐвай, у раздзеле "Навіны" — інфармацыя аб мерапрыемствах. Стварэнне і дзейнасць музейнага пакоя Н.Дз. Кавалѐвай – даніна глыбокай павагі ад землякоў, скарбонка літаратурна-краязнаўчых ведаў нашага рэгіѐна, каштоўны здабытак літаратурнай спадчыны Беларусі.

## Наша спадчына

*(краязнаўчая дзейнасць бібліятэкі ў рамказ мэтавых праектаў)*

**Даклад да ўдзелу ў Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Бацькаўшчына" (г. Горкі БДСХА, 2021 г.)**

***Шэвардова Алена Міхайлаўна,***
*Бібліятэкар Цемналескай бібліятэкі-філіяла*
*ДУК "Дрыбінская бібліятэчная сетка"*
*(в. Цёмны Лес, Дрыбінскі раён)*

***Слайд 1.*** Не толькі сцежку, рэчку, дом,
Любоў, сяброў і песню матчыну.
Мы прыгажосць душы бяром.
Ад нашых прадзедаў у спадчыну.

вясковых жыхароў Дрыбінскага раёна, іх культурная спадчына.

Ніну Дзмітрыеўну памятаюць і паважаюць на Дрыбіншчыне. У Цемналескай бібліятэцы-філіяле з дапамогай юных краязнаўцаў, членаў клуба "Спадчына" створаны літаратурна-краязнаўчы музейны пакой Н.Кавалѐвай "Паэтычная зорка маленькай радзіма". На ўрачыстым адкрыцці музейнага пакоя, якое адбылося 21 сакавіка 2014 года, прысутнічалі жыхары вѐскі Цѐмны Лес, прадстаўнікі мясцовай улады, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Дрыбінскага і Горацкага раёнаў, члены клуба творчых сустрэч "Вянок Дрыбіншчыны" і народнага аб'яднання "Роднае слова". Музейны пакой размешчаны ў памяшканні бібліятэкі і займае асобную залу плошчай 9,4 м 2. На момант адкрыцця ў фонд музейнага пакоя было ўключана 450 экспанатаў.

Усе экспанаты ўмоўна падзяляюцца на дзве экспазіцыі. Экспанаты першай экспазіцыі "Жыццѐ і творчасць Ніны Кавалѐвай да 1986 года" распавядаюць, пераважна, аб фактах жыцця паэтэсы ў роднай вѐсачцы Еськаўка. З прыгожага партрэта, кароткай біяграфіі, верша-прысвячэння земляка пачынаецца з экспазіцыямі музейнага пакоя. Фатаграфіі з сямейнага архіву ў драўляных рамках дапаўняюць інфармацыю з асабістых дакументаў паэтэсы. Сцены гэтай часткі музейнага пакоя багата ўпрыгожаны рэчамі вышытымі раней Нінай Дзмітрыеўнай і яе маці.

У 28 гадоў Ніна Кавалѐва напісала свае першыя вершы і адаслала іх у газету "Советская Белоруссия". Яе талент заўважыў журналіст Раман Ярохін. Аб гэтым факце сведчаць запісы ў блакнотах паэтэсы і артыкулы з газеты, а галоўнае – кніга Р. Ярохіна "Интонация вздоха". У гэтай частцы музейнага пакоя створана імправізаванае рабочае месца пачынаючай паэтэсы. Тут прадстаўлены асабістыя рэчы зямлячкі: друкарская машынка, рукапісныя і машынапісныя тэксты, а таксама аловак, якім Н.Кавалѐва стукала па клавішах калі, па прычыне хваробы, ператалі слухацца рукі. У той час да паэтэсы прыходзілі школьнікі, аднавяскоўцы, прыязджала рэспубліканскае тэлебачанне. Яшчэ на малой радзіме быў зняты відыѐфільм "Эхо доброты". Аб чым распавядаюць частка плѐнкі з фотаздымкам і запісы ўспамінаў землякоў.

Другая экспазіцыя "Жыццѐ ў Горках. Літаратурная спадчына Ніны Кавалѐвай", прысвечана падзеям жыцця і творчасці нашай зямлячкі на яе другой радзіме. Але некаторыя экспанаты гэтай экспазіцыі маюць прамое дачыненне да першай. Такім чынам, прасочваецца цесная сувязь паміж рознымі перыядамі жыцця Н. Кавалѐвай. Тут захоўваюцца зборнікі вершаў, шматлікія публікацыі ў СМІ, аўдыѐзапісы, рукапісы і іншае. Сярод экспанатаў таксама размешчаны дакументы і рэчы, якія характэрызуюць прыналежнасць Н.Дз. Кавалѐвай да Саюза пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь – копіі членскіх білетаў, артыкулы з газет, шарыкавая ручка і сумачка. На асобных паліцах прадстаўлены копіі нот музычных твораў, напісаных на вершы нашай зямлячкі, аўдыѐзапісы песень, відыѐфільмы, зробленыя бібліятэкарамі біябібліяграфічныя матэрыялы аб жыцці і творчасці паэтэсы (у тым ліку на электронных носьбітах інфармацыі).



На гэтым наша знаѐмства з экспанатамі музейнай комнаты скончана. Дзякуй за ўвагу!

***Вядучы:*** Паважаныя сябры, сѐння на нашым свяце прысутнічаюць дарагія госці, прадстаўнікі раённага кіраўніцтва, родныя, землякі паэткі, члены клуба "Вянок Дрыбіншчыны", а таксама прыхільнікі паэтычнага слова Ніны Дзмітрыеўны – чытачы бібліятэкі.

З прывітальным словам ад мясцовай улады выступае Дзмітрый Леанідавіч Пімашэнка – намеснік старшыні Дрыбінскага РВК і Алена Мікалаеўна Рэбкавец – начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Дрыбінскага РВК.

***Выступленне Д.Л.Пімашэнка, А.М.Рэбкавец.***

***Вядучы:*** Дзякуй вам, Алена Мікалаеўна і Дзмітрый Леанідавіч. Мы рады вітаць на Дрыбіншчыне паважаных гасцей з Горацкай зямлі. Слова прадастаўляецца супрацоўніку ДУК "Горацкі раённы гісторыка-этнаграфічны музей" кіраўніку народнага літаратурнага аб'яднання "Роднае слова" Л.М. Дзеружковай і дырэктару ДУК "Горацкая бібліятэчная сетка" Н.М. Ермалаевай а таксама выканаўцы песень Ніны Дзмітрыеўны артыстцы Горацкага краю Н.І. Курбасавай. Калі ласка вам слова, паважаныя госці!

***Выступленне Л.М. Дзеружковай і іншых гасцей.***

***Вядучы:*** Дзякуй вам, Людміла Мікалаеўна і Наталля Міхайлаўна. А зараз ад гасцей з Горак для ўсіх прысутных гучыць музычны падарунак.

***Гучаць песні ў выкананні Н.І. Курбасавай.***

***Вядучы:*** Дзякуй вам, паважаныя госці, за такі цудоўны падарунак. А мы ў сваю чаргу перадаѐм Ніне Дзмітрыеўне кветкі і падарунак ад землякоў, жыхароў Дрыбіншчыны.

***Уручаюцца кветкі і падарунак.***

***Вядучы:*** Мы таксама рады вітаць родных і землякоў Ніны Кавалѐвай, тых, хто доўгія гады быў побач з пачынаючай паэткай. Ад імя аднавяскоўцаў выступіць Таццяна Віктараўна Балбекава – настаўнік малодшых класаў ДУА "Цемналескі ВПК яслі-сад-базавая школа".

***Выступленне Т.В. Балбекавай.***

***Вядучы:*** Вялікі дзякуй вам, Таццяна Віктараўна. А зараз хочацца перадаць слова Галіне Мікалаеўне Руднікавай, члену літаратурнага аб'яднання "Вянок Дрыбіншчыны".

***Вядучы:*** Вялікі дзякуй вам, Галіна Мікалаеўна. Паважаныя сябры, урачыстая частка нашага мерапрыемства скончылася, а зараз запрашаем вас прадоўжыць нашу сустрэчу ў рамках пасяджэння клуба "Вянок Дрыбіншчыны", прымеркаванага да Сусветнага дня паэзіі.

***Пасяджэнне клуба творчых сустрэч "Вянок Дрыбіншчыны".***

**Літаратурна-краязнаўчы бібліямарафон**
**“Тут лёс мой, матуля, радзіма мая”**
*Для розных катэгорый наведвальнікаў бібліятэкі*

***Мэта мерапрыемства.***
Папулярызацыя ведаў аб літаратурнай, культурнай, эканамічнай, гістарычнай спадчыне роднага краю сярод розных катэгорый наведвальнікаў бібліятэкі-філіяла. Выхаванне ў прадстаўнікоў падрастаючага пакалення павагі да сваёй Радзімы, адказнасці ў грамацкім і прафесійным жыцці.
***Падрыхтоўка мерапрыемства:*** літаратурна-краязнаўчы музейны пакой Ніны Дзмітрыеўны Кавалёвай “Паэтычная зорка маленькай радзімы”; выстава з асобнымі раздзеламі “Тут лёс мой”, “Матуля”, “Радзіма мая”, адпаведнымі назве бібліямарафона; камп’ютар, відэапраектар; аўдыёвізуальныя дакументы, створаныя бібліятэкай; лістоўкі-віншаванкі і лістоўкі-закладкі, падрыхтаваныя да мерапрыемства; краязнаўчы пашпарт установы.
***Дзеючыя асобы:*** бібліятэкар; розныя катэгорыі наведвальнікаў бібліятэкі -філіяла.
***Праграма правядзення.***
10.00 — краязнаўчае даследванне “Прафесійнае жыццё вёскі”;
11.30 — літаратурная віншаванка “Слова пра маці”;
13.00 — літаратурна-краязнаўчы круіз “Наша спадчына”;
16.00 — літаратуна-краязнаўчы флэшбук “Старонка як маці…”.

***Дата правядзення:*** 14.10.2016.
***Месца правядзення:*** тэрыторыя вёскі Цёмны Лес; Цемналеская бібліятэка – філіял; ДУА “Цемналескі ВПК яслі-сад-базавая школа”.
***Колькасць, катэгорыя наведвальнікаў:*** дзеці, падлеткі, моладзь, дарослыя – 85 чалавек.
***Складальнік і арганізатар:*** бібліятэкар Шавардова А.М.

***Эпіграф.***
Кожная сцежка і кожны куток,
Тут мне да болю знаёмы.
Душу саграває зялёны лісток
І сэрца няведае стомы.
Што для цябе магу я зрабіць,
Родная вёсачка наша?
Толькі магу не забыць –
Як зелянее тут пашня.
Якія прыгожыя кветкі растуць,
За роднаю хатай на лузе.
І побач тут добрыя людзі жывуць…
Няма больш такіх у акрузе.
***Алена Шавардова***



маленькай радзімы”.
Дзякуй усім, хто завітаў на наша мерапрыемства, жадаем здароў’я, міру і ладу ў вашых сем’ях! І на развітанне прапануем паслухаць аўдыёзапіс песні “А ў Цёмным Лесе”, словы Н. Кавалёвой, музыка С. Ганаболева. Дзякуй за ўвагу!

*Песня “А ў Цёмным Лесе” словы Н. Кавалёвой, музыка С. Ганаболева.*

*Неафіцыйная частка мерапрыемства:*
*Народныя песні ў выкананні “Журавінкі”.*
*Гутаркі-абмеркаванні паміж прысутнымі.*
*Развітанне з гасцямі.*

# Прыклады дакладаў для канферэнцый
**Паэтычная зорка маленькай радзімы**
*(работа літаратурна-краязнаўчага музейнага пакоя Ніны Дзмітрыеўны Кавалёвай на базе Цемналескай бібліятэкі-філіяла)*
***Даклад да ўдзелу ў навукова-практычнай Рэспубліканскай канферэнцыі “Пысінскія чытанні” (г. Магілёў УК “Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна”, 2016)***
*Шэвардова Алена Міхайлаўна,*
*Бібліятэкар Цемналескай бібліятэкі-філіяла*
*ДУК “Дрыбінская бібліятэчная сетка”*
*(в. Цёмны Лес, Дрыбінскі раён)*

Культурная спадчына кожнай мясцовасці мае свае асабістыя літаратурныя дыяменты. Гонар Цемналескай старонкі — вядомая беларуская паэтэса, ураджэнка вѐскі Еськаўка Дрыбінскага раѐна Магілѐўскай вобласці, член Саюза пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь
(1997) – Ніна Дзмітрыеўна Кавалѐва. Яна – лаўрэат Літаратурнай прэміі імя В. Хомчанкі Магілѐўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі (2011), суіскальнік Міжнароднай прэміі “Філантроп” (2000), пераможца рэспубліканскіх, абласных, раѐнных конкурсаў. Па выніках якіх, Ніна Кавалѐва была ўзнагароджана, дыпломамі 1-й і 2-й ступеней. У дадзены момант паэтэса жыве ў г. Горкі Магілѐўскай вобласці. Яна амаль поўнасцю паралізавана, прыкавана да ложка. Але, нягледзячы на цяжкі стан здароў’я, Ніна Дзмітрыеўна вельмі плѐнна працуе на ніве паэзіі, а апошнім часам і прозы. Літаратурная спадчына Ніны Кавалѐвай — 21 асабісты зборнік і больш за 5 калектыўных. Аб жыцці і творчасці знакамітай зямлячкі надрукавана шмат артыкулаў у раѐнных, абласных, рэспубліканскіх сродках масавай інфармацыі. Выходзілі ў эфір радыѐперадачы і відыѐфільмы на беларускіх радыѐ і тэлебачанні. Да многіх вершаў прафесійнымі і самадзейнымі кампазітарамі, у тым ліку і самой паэтэсай, напісана музыка. Вершы, апавяданні і асобныя зборнікі Н. Кавалѐвай, прысвечаныя малой радзіме — асаблівы летапіс жыцця

*Выступленне Алены Шутавай*

Дзякуй Вам Алена Іванаўна

***Вядучы** 1*

Взглянуть на вечность, озаряясь светом,
Идущим, только от красивых дел.
Творить добро, не ведая об этом, -
То был святых подвижников удел.

Героем стать и скромно затеряться
Среди далёких от добра сердец,
Стоять в толпе и тихо улыбаться,
Что на других возложен твой венец…

***Вядучы 2***

Кажуць, што ў жыцці кожнага чалавека ёсць месца подзвігу. Але, кожная хвіліна жыцця Ніны Дзмітрыеўны Кавалёвай — сапраўдны подзвіг. Прыкаваная да ложка, яна не скардзіцца на сваё цяжкае становішча, а наадварот, робіць усё магчымае каб дапамагчы іншым. Творчасць Ніны Дзмітрыеўны — духоўны набытак чалавека, які шануе і выконвае запаветы Бога, любіць свет і усіх нас.

Ты гаварыў, усё ты можаш.
Скажы, а боль чужы ты возьмеш,
Каб чалавек пайшоў свабодна
І усміхнуўся нам лагодна.

Каб ад жахлівай грознай ночы
Ён не заплюшчваў моцна вочы,
А расчыніў у свет акенца,
Бо ўжо паўболю застанецца…

***Вядучы 1***

За пяцігоддзе свайго існавання музейны пакой не страціў актуальнасці, наадварот скарбонка яго экспанатаў усё больш прываблівае ўвагу аматараў паэтычнага слова, прафесійных дзеячаў з розных рэгіёнаў Беларусі і замежных краін. Зусім нядаўна пры дапамозе Ніны Дзмітрыеўны і Алены Іванаўны Шутавай бібліятэка наладзіла сувязь з кампазітарам Сяргеем Ганаболевым ён раней пісаў музыку на вершы нашай зямлячкі. Зараз кампазітар жыве ў Расіі, але з вялікай ахвотай згадзіўся з намі супрацоўнічаць і папрасіў высылаць вершы Ніны Кавалёвай з яе новых зборнікаў для стварэння новых музычных твораў. Новыя знаёмствы у нашым выпадку, падобны на вясеннія ручайкі, якія сцякаюць у чыстае возера паэтычнага слова нашай зямлячкі. Напрыканцы нашай сустрэчы, запрашаем усіх прысутных прымаць актыўны ўдзел у рабоце літаратурна-краязнаўчага музейнага пакоя Ніны Кавалёвай "Паэтычная зорка



***Ход мерапрыемства***

**10.00 — Краязнаўчае даследванне "Прафесійнае жыццё вёскі".**

***План:***

1. Сустрэча ў бібліятэцы.
2. Знаёмства з дзейнасцю Цемналескага ляснічаства, передача краязнаўчага пашпарта для запаўнення.
3. Знаёмства з дзейнасцю Цемналескага фельшарска-акушэрскага пункта, аддзялення сувязі, передача краязнаўчага пашпарта для запаўнення.
4. Знаёмства з дзейнасцю станцыі Цёмны Лес, передача краязнаўчага пашпарта для запаўнення. Арганізацыя сустрэчы з начальнікам станцыі з мэтай відэазапісу гутаркі аб прафесіі дзяжурнага па станцыі.
5. Вяртанне ў бібліятэку. Работа над запаўненнем краязнаўчых пашпартоў устаноў.

**11.30 — Літаратурная віншаванка "Слова пра маці".**

Дарагія матулі, дзеці! Безумоўна, маці адыгравае вельмі важную ролю ў жыцці кожнага чаалавека. Менавіта таму, наша з вамі зямлячка Ніна Дзмітрыеўна Кавалёва больш за іншых беларускіх аўтараў піша пра сваю маці. Ганна Ягораўна Кавалёва ўсё сваё жыццё прысвяціла дзецям. Да апошняй сваёй хвіліны яна даглядала паралізаваную дачку Ніну. У першую чаргу, дзякуючы падтрымцы сваіх бацькоў, Ніна Кавалёва стала знакамітай паэтэсай.

Вельмі часта ў вершах Ніны Дзмітрыеўны вобраз маці яднаецца з вобразам малай радзімы ў адно цэлае – роднае кожнаму з нас.

**Як дзіця, радзіма плача…**

Як дзіця, радзіма плача,
Растаецца з цішынёй.
Гэта з вамі мы, няйначай,
Робім так балюча ёй.

Чым суцешыць нашу маці?
Мо пачуццяў нестае
Пра любоў сваю сказаці,
Каб парадаваць яе?

А яна ж нас калыхала,
Каб высокі шлях знайшлі,
Песні добрыя спявала,
Што ў сэрцы ўвайшлі.
Дык няхай жа тыя песні
Стануць сцежкамі жыцця,
Хай радзіма ўваскрэсне
І не плача, як дзіця.

*[Голас вякоў; ст.8].*

Матчыны песні далі аснову творчасці нашай зямлячкі.

**Матчыны песні**
Матчыны песні.
Толькі два словы,
А перад імі
Схіляць галовы.

Дзед мой і бацька
Добра спявалі,
Матчыны песні
Мне перадалі.

Мне іх да сонца
Трэба ўзняці,
Бо ў іх радзіма,
Лёс мой і маці.

Крыўда і праўда –
Як дзве стыхіі.
Матчыны песні –
Словы якія!

Гора спазнае
І задыхнецца,
Хто паспрабуе
Вырваць іх з сэрца.

Дарагія матулі! Ад сябе асабіста і ад Ніны Дзмітрыеўны я віншую Вас са святам. Жадаю поспехаў і здароўя, добрых спагадлівых дзетак. А зараз для вас прагучыць прагучыць песня на вершы Ніны Кавалёвай, якая так і называецца "Матуля". А ад бібліятэкі я хачу перадаць вось такія віншаванкі (паказаць). Таксама вершы Ніны Кавалёвай пра маці. Дзякуй за увагу! Да новых сустрэч!

**13.00 - Літаратурна-краязнаўчы круіз "Наша спадчына".**

***План правядзення:***

1. Наведванне ДУА "Цемналескі ВПК яслі-сад-базавая школа".
2. Сустрэча гасцей у бібліятэцы-філіяле. Знаёмства з бібліятэкай.
3. Асноўная частка праходзіць ў бібліятэцы (гісторыя вёскі Цёмны Лес; агляд раздзелаў выставы "Тут лёс мой", "Матуля", "Радзіма мая"; знаёмства з творчасцю землякоў; экскурсія па літаратурна-краязнаўчым музейным пакоі Ніны Дзмітрыеўны Кавалёвай "Паэтычная зорка маленькай радзімы"; знаёмства з аудыёвізуальнымі дакументамі аб жыцці і творчасці Ніны Кавалёвай; аповед аб шапавалах Цемналескай старонкі з дэманстрацыяй медыяпрэзентацы "У госці да шапавалаў").



Шёл солдат и юн, и бородат,
И такой, что пряди за спиною.
Испугался юный тот солдат,
Ведь впервые встретился с войною,

Но вскричал: «Мужайся и держись,
Отведи от хат родимых беды».
И забыл про собственную жизнь.
А иначе б не было Победы.

Сколько их, подкошенных войной,
Удивлённо падали, как дети.
А в глазах небесной синевой
Занималось утро на планете.

****
Разбіты варожыя зграі
Ды ў шрамах пякучых паляны.
Ды шмат іх у Дрыбінскім краі
Загінуўшых і растраляных.
Прад імі ў вячэрнім спакоі
Не схіліць галоўку рамонак.
Самотныя спісы герояў
Глядзяць на нас з кніжных старонак.
Ахвяры растрэлаў і здрады,
Ахвяры ваеннага ката…
Палітыкі рвуцца да ўлады,
Знішчаючы сябра і брата.
У Еськаўцы, Біры, Палосках…
У вёсках, дзе гора спазналі,
Старэлі дубы і бярозкі,
А ўдовы мацнелі – чакалі.
На спісах самоты і болю
Гісторыя кропкі паставіць.
Нікому не знішчыць ніколі
Жывую народную памяць
Верш Ніны Кавалёвай

***Вядучы* 2**

Паважаныя сябры сёння ў нашай зале прысутнічае грамадзянка Расійскай федэрацыі афіцэр медыцынскай службы запасу Алена Іванаўна Шутава. Алена Іванаўна ўнучка ўраджэнкі вёскі Паташня Антаніны Рыгораўны Зухцікавай. Аднойчы наведаўшы наш музейны пакой яна стала жаданым госцем у бібліятэцы і ў самой Ніны Дмітрыеўны. Калі ласка Алена Іванаўна Вам слова.

я возвратиться,
Дрибинщина – родина моя.

Любоў і павага да Дрыбінскай зямлі чырвонай ніткаю праходзіць праз усю творчасць Ніны Дзмітрыеўны Кавалёвай. Радкі вершаў-прысвячэнняў нашай зямлячкі выкарыстоўваюцца у розных накірунках інфармацыйна-культурнай дзейнасці края. Папулярызацыяй творчасці Ніны Кавалёвай сярод сваіх наведвальнікаў займаюцца ўсе бібліятэкі Дрыбіншчыны. Аб рабоце ў гэтым накірунку і выніках дзейнасці музейнага пакоя раскажа дырэктар ДУК "Дрыбінская бібліятэчная сетка" Марына Аляксандраўна Сакалова.

*Выступленне дырэктара М.А. Сакаловай*

Дзякуй Вам, Марына Аляксандраўна, за надзейную падтрымку і добрыя словы.

***Вядучы 2***

Творчасць Ніны Дзмітрыеўны Кавалёвай мае вялікае значэнне ў выхаванні падрастаючага пакалення. Таму экспанаты музейнага пакоя заўсёды запатрабаваны ў навучальным працэсе. Аб дзейнасці па вывучэнню жыцця і творчасці нашай зямлячкі раскажа намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Таццяна Уладзіміраўна Маліноўская.

*Выступлене Т.У. Маліноўскай.*

Дзякуй Вам Таццяна Ўладзіміраўна.

А зараз паслухайце, калі ласка, песні "Верность" і "Диалоги о солдатах" словы і музыка Ніны Кавалёвай у выкананні артысткі Горацкага краю Надзеі Курбасавай!

***Вядучы 1***

Нягледзячы на тое, што Ніна Кавалёва нарадзілася і вырасла ў пасляваенны час, нязгасная памяць беларускіх людзей аб трагічнай старонцы гісторыі выразна адлюстроўваецца ў яе творчасці. Кожны год на аснове вершаў Ніны Дзмітрыеўны мы праводзім літаратурна-музычныя кампазіцыі, мітынгі і іншыя мерапрыемствы, прысвечаныя тэме ВАВ. Да 75-й гадавіны вызвалення Дрыбіншчыны ад нямецка-фашыстскіх захопнікаў вучні Цемналескай школы падрыхтавалі наступныя вершы.

****

Слушая стихи военных лет,
Люди принимают как награду,
Подвигом заслуженный ответ
На святую горестную правду.



4. Вяртанне да дому праз станцыю Цёмны Лес (гісторыя станцыі Цёмны Лес; знаёмства з прафесійнай дзейнасцю станцыі). .

**16.00 - Літаратурна-краязнаўчы флэшбук "Старонка як маці..."**

***Гучыць песня на словы і музыку Ніны Кавалёвай "Матуля."***

Добры дзень, паважаныя госці! Наша з вамі чарговая сустрэча прысвячаецца Дню маці, роднай старонцы і нашай зямлячцы Ніне Дзмітрыеўне Кавалёвай.

Зараз я запрашаю вас наведаць літаратурна-краязнаўчы музейны пакой "Паэтычная зорка маленькай радзімы", створаны на аснове матэрыялаў і дакументаў аб жыцці і творчасці знакамітай паэтэсы.

***Экскурсія па музейным пакоі Ніны Кавалёвай.***

Я не здарма вызначыла творы Ніны Кавалёвай. У многіх яе вершах вобраз маці і роднай старонкі яднаюцца ў адно цэлае, вельмі дарагое кожнаму з нас.

На працягу мерапрыемства бібліятэкар чытае вершы з кніг, трымаючы іх у руках.

***Верш "Старонка як маці"..."***

Пасля пераезду ў Горкі Ніна Дзмітарыеўна не забывае яркія малюнкі свайго дзяцінства, развітанні і сустрэчы з маці, роднай вёскай.

***Верш "Мама"...***

*[Ликующий полёт; ст.14].*

Маці аберагае сваё дзіця, вучыць усяму, што ўмее сама, дае запавет.

***Верш "Маці"...***

*[Як рыбка з вадою; ст.56].*

Родная хаціна, маці, бацька сталі для нашай зямлячкі надзейным прытулкам у цяжкія хвіліны жыцця.

***Верш "Родная хаціна"...***

*[Голас вякоў; ст.48].*

Ніна Кавалёва нарадзілася пасля вайны. Яна не мае сваіх дзетак, але жудасныя малюнкі Вялікай Айчынай вайны, вобразы пакінутых удоў і сірацінак даволі часта сустракаюцца ў яе творчасці.

***Верш "Мать і сын"...***

*[Васильковая кадриль; ст.89].*

Любоў да матчынай песні Ніна Дзмітрыеўна пранесла праз ўсё жыццё.

***Верш "Когда поют отец і сын"...***

*[Напиток певчих птиц; ст.10].*

Матчыны песні далі аснову творчасці нашай зямлячкі, паслухайце калі ласка, што яна піша наконт гэтага.

***Верш "Матчыны песні"[****Зов любви; ст.97].*

Дарагія госці! А зараз я прапаную вам паглядзець відэазапіс аб жыцці і творчасці нашай зямлячкі.

***Дэманстрацыя відэазапісу***

Дарагія матулі ад сябе асабіста і ад імя Ніны Дзмітрыеўны я віншую Вас

са святам, жадаю поспехаў і здароўя. Няхай вашы дзеці заўсёды памятаюць пра вас. І ў напамін аб нашай сустрэчы, хачу падараваць лістоўкі-віншаванкі з творамі нашай зямлячкі пра вас. Дзякуй за ўвагу! Да новых сустрэч!

**Буктрэйлер**
**“Творы Ніны Кавалёвай для дзяцей”**
*Для дзяцей і падлеткаў*

*Цітры:* Дзяржаўная ўстанова культуры “Дрыбінская бібліятэчная сетка” Цемналеская бібліятэка-філіял.

***Сцэна 1***. Школа. Настаўнік на ўроку пазакласнага чытання. На дошцы назва урока “Творы для дзяцей Ніны кавалёвай”, партрэт, біяграфія і іншыя дакументы аб жыцці і творчасці нашай зямлячкі.

*Настаўнік:* “Дзеці! Да наступнага ўрока уважліва прачытайце творы для дзяцей нашай зямлячкі Ніны Дзмітрыеўны Кавалёвай. Іх можна знайсці ў літаратурна-краязнаўчым музейным пакоі ў Цемналескай бібліятэцы-філіяле”.

*Цітры:* “Урок пазакласнага чытання”; “Паэтычная зорка маленькай радзімы”.

***Сцэна 2.*** *Бібліятэка. Бібліятэкар сустракае дзяцей.*

*Дзеці:* **“**Добры дзень Алена Міхайлаўна! Вельмі патрэбны творы Ніны Кавалёвай для нас”.

*Бібліятэкар: “*Добры дзень мае дарагія! Пашукайце іх, калі ласка, сярод экспанатаў нашага музейнага пакоя”.

*Дзеці падыходзяць да кніг і узрадавана крычаць: “*Вось яны!”

*Потым па чарзе паказваюць іх і напамяць чытаюць па ўрыўку з кожнага зборніка.*

*1 вучань праходзяць, чытае урывак з кнігі «Вода-чудесница ”*
(1994): “Зачирикал воробей:
“Я умоюсь побыстрей….”
*2 вучань праходзіць, чытае урывак з кнігі “Есть у дождика подружка” (1998):*
“Есть у дождика подружка –
Быстроногая Катюшка….”
*3 вучань праходзіць, чытае урывак з кнігі “Хто галоўны на сяле” (2004*):
“Пад акном гурток хлапечы,
Зноў спрачаецца аб нечым…”
*4 вучань праходзіць, чытае урывак з кнігі “Божья заповедь” (2005):*
“Христос родился в январе,
Когда бушует вьюга,
И всем живущим на земле
Сказал любить друг друга...”
*5 вучань праходзіць, чытае урывак з кнігі “Нарисуем всё про нас” (2007):*
“Плавать я один учился,



Дзякуй, Людміла Мікалаеўна.

***Вядучы 1***

Святлана Аляксандраўна таксама наша зямлячка, ураджэнка Цемналескай акругі, ў мінулым медыцынскі работнік. Як калега па пяру, яна часта прымае ўдзел у мерапрыемствах па папулярызацыі творчасці Н.Дз. Кавалёвай. Калі ласка, Святлана Аляксандраўна Вам слова.

*Выступленне Святланы Цярэшка.*

Дзякуй, Святлана Аляксандраўна!

*Выступленне Святланы Ільінішны Ластачкінай.*

Дзякуй, Святлана Ільінічна!

Мы ведаем, што сёння ў гэтай зале прысутнічаюць члены народнага літаратурнага аб’яднання “Роднае слова”.

*Выступленне членаў аб'яднання*

Дзякуй Вам паважаныя.сябры!

***Вядучы 1:***
Я живу, грустинки не тая,
По земле, где мне
пришлось родиться.
Много долгих лет
мне только снится
Дрибинщина – родина моя.
К родникам её хотела б я
Ласковой дождинкой
приложиться,
Не пройду по ней,
мне только снится
Дрибинщина – родина моя.
Там сейчас метелят тополя,
Колосится дружная пшеница.
Я люблю те сны,
в которых снится
Дрибинщина – родина моя.
Говорю ей: «Милая земля»,
Вытирая слёзы на ресницах,
Как хочу к тебе

У куфэрках – дар чароўны:
Гонар продкаў – даўніна.

***Чытальнік 9: Анішчанка Кіра***

Для суседзяў мы адкрыты,
Ёсць што людзям паказаць.
Мы цяпер не лыкам шыты,
Можам Зоркі зарабляць.
Працавітых паважаюць,
З імі лёгка справы мець.
І дажыначкі спраўляюць –
Люба-дорага глядзець.

*Чытальнік 10: Жураўскія Ярамір*

А таржкі чаго тут варты!
Сам прыходзь, глядзі бліжэй,
Як мясцовы гумар, жарты
Цягнуць вусны да вушэй.
І пяюць хвалу валёнку –
Тут не жарты ўжо пайшлі,
І кладуць яго ў скарбонку
Слаўнай дрыбінскай зямлі.

***Вядучы 2***

Дзве радзімы гушкаюць мяне,
І дзве мовы нада мной спяваюць,
Дзве рукі такія падтрымаюць,
І мяне ліхое абміне.
Ніна Кавалёва

***Вядучы 1***

Кніга Ніны Кавалёвай "Як купалі ў купелі" стала папулярнай сярод чытачоў Дрыбінскага і Горацкага раёнаў. Аб гісторыі выхаду ў свет каштоўнага выдання больш падрабязна раскажуць паважаныя госці з Горацкага раёна. Я запрашаю да мікрафона нашу зямлячку-спецыяліста дзяржаўнай установы "Горацкі РЦСОН" Людмілу Уладзіміраўну Краўцову.

У праграме выступлення гасцей: аповед пра выданне кнігі "Як купалі ў купелі", песні Ніны Кавалёвай: "Город над Проней", "Черёмуховый Лес" у выкананні вакальнага калектыву "Сузор'е" дзяржаўнай установы "Горацкі РЦСОН", верш Ніны Кавалёвай "Значит тёмный лес…"

Вялікі дзякуй Вам паважаныя госці!

***Вядучы 2***

Вось ужо шмат гадоў мы цесна супрацоўнічаем з Н.Дз. Кавалёвай і кіраўніком народнага аб'яднання "Роднае слова" Людмілай Мікалаеўнай Дзеружковай, што дзейнічае пры Горацкім гісторыка-этнаграфічным музеі. Добрасуседскія ўзаемаадносіны безумоўна падтрымліваюць дзейнасць нашага музейнага пакоя. Калі ласка, Людміла Мікалаеўна Вам слова.

***Выступленне Л.М. Дзеружковай.***



Ой, чуть-чуть волной не смылся!.."
6 вучань праходзіць, чытае урывак з кнігі "Кветкі Багародзіцы" (2005):
"Скачуць здзіўлена дажджынкі:
"Ой у вас ужо дажынкі!.."

***<u>Сцэна 3.</u>***

*Бібліятэкар:* Вось якія малайцы! Добра ведаеце творы нашай зямлячкі! Яны вам спадабаліся?

Дзеці адказваюць разам: "Да!"

*Бібліятэкар: "*Творы для дзяцей Ніны Кавалёвай дапамагаюць кожнаму, хто іх чытае, зазірнуць ў непаўторны свет свайго дзяцінства, убачыць прыгажосць роднай старонкі, адчуць дабрыню і пяшчоту бацькоў, пазнаць запаветы Бога. Цітры:Прачытайце кнігі для дзяцей Ніны Кавалёвай"

*Цітры на фоне фота (3-усе паасобку)*

У фільме здымаліся:
Настаўнік – …
Бібліятэкар – ...
Вучні 5 класа – ...
Цітры на фоне фота (3-усе паасобку)
Над фільмам працавалі:
Рэжысёр, аператар, гукааператар, рэдактар і г.д...

ДУК "Дрыбінская бібліятэчная сетка"
Цемналеская бібліятэка-філіял

## Літаратурна-музычная кампазіцыя
## "Паэтычная зорка маленькай радзімы"

(у рамках юбілейнага Года адкрыцця музейнага пакоя)

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ ПАД ТЭКСТ МЕРАПРЫЕМСТВА

*1 СЛАЙД — цітульны з назвай мерапрыемства.*

*2. СЛАЙД — станцыя Пагодзіна на фота + ўдыёзапіс "Вакзал" на слайдзе. Інсцэніроўка верша Ніны Кавалёвай "У вокзальной кассы" у выкананні* народнага ансамбля "Журавінка".

***Хлопец:***

— Вы с мужем или без?
Куда билет берёте?
Дзяўчына:
— Я еду в Тёмный Лес.
Хлопец:
— Да вы шутница вроде.
Там страшно и темно…

*3 СЛАЙД —* станцыя "Цёмны Лес, фота.

***Дзяўчына:***

— А ты то парень, — промах.

Да там светлей, чем днём,
От кружевных черёмух.
Ты сам живёшь во мгле,
Свой край не познавая,
А на твоей земле есть станция такая.
Певучий Тёмный Лес.
Народные артисты.
У стежки из чудес
Родник звенит монистом.
О, родина, мой род,
Моя земля родная!
Она в душе поёт,
Слова любви рождая.

*4 СЛАЙД — аўдыёзапіс “Прыход цягніка на станцыю”+ фота музейнага пакоя. На гэтым фоне словы вядучага.*

***Вядучы 1:***

Добры дзень дарагія землякі, паважаныя госці! Роўна пяць гадоў таму назад 21 сакавіка 2014 года ў літаратурным жыцці нашага краю адбылася важная падзея. Пры Цемналескай бібліятэцы-філіяле быў адкрыты літаратурна -краязнаўчы музейны пакой Ніны Дзмітрыеўны Кавалёвай “Паэтычная зорка маленькай радзімы”. Кожны з экспанатаў музейнага пакоя распавядае аб пэўным перыядзе жыцця знакамітай паэтэсы, высвятляе значэнне яе творчасці і асабістыя рысы характару.

Мой тихий край, девчонку породив,
Развеял материнскую тревогу:
Чужие вёрсты рано обходив,
Она вернётся к отчему порогу.

*5 СЛАЙД — на фота тэкст “Ніна Дзмітрыеўна Кавалёва”.*

***Вядучы 2:***

Наша зямлячка Ніны Дзмітрыеўна Кавалёва — вядомая беларуская паэтэса, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, дыпламант раённых, абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. Яна актыўна ўдзельнічае ў рабоце літаратурных аб’яднанняў “Роднае слова” і “Вянок Дрыбіншчыны”. У 2018 годзе Ніна Дзмітрыеўна ўступіла ў Беларускі Саюз жанчын. Зусім нядаўна Горацкім раённым выканаўчым камітэтам Ніне Кавалёвай прысвоена ганаровае званне “Чалавек года — 2018” ў намінацыі “Грамацка-палітычная дзейнасць”. Яна аўтар 24 асабістых зборнікаў. Больш за 40 вершаў паэтэсы пакладзены на музыку. Асноўная частка твораў зямлячкі прадстаўлена сёння ў гэтай зале на выставе-экспазіцыі з музейнага пакоя.

*6 СЛАЙД* — на фота экспазіцыя музейнага пакоя.

***Вядучы 1:***

*(Кароткі агляд выставы).*

Музейны пакой Ніны Кавалёвай і да гэтага часу — адзіны ўнікальны



“Прачышчае” гэты лес.
Можа, тут і не да смеху,
Ды Снягурка з Дзеда кпіць:
У кантору ён паехаў,
Трэба ёлачку купіць.

***Чытальнік 5: Слаўнікава Арына***

А на добрыя пачуцці
Тут гармоніка стае:
Ён запросіць у Пакуцце,
Дзе наш Зюлікаў жыве.
Камандзірыць ён ці жонка?
Хто каваль? А хто пчаляр?
Закажыце ў іх валёнкі –
Сапраўды народны дар.

***Чытальнік 6: Бібліятэкар***

Неяк дзеці завіталі,
Дык не выцягнуць было:
Разам з майстрам працавалі –
Вывучалі рамяство.
Вывучайце, пераймайце
І нясіце у жыццё,
Ды на вецер не пускайце
Дарагое набыццё.

***Чытальнік 7: Шчарбакоў Ваня***

Расказалі мы сягоння
Паважанай грамадзе,
Як у Дрыбінскім раёне
Справа розная ідзе.
Пры сустрэчы як шануюць –
Падаюць аж дзве рукі.
Як нязлосна тут шуткуюць
Беларусы-землякі.
Па-катрушніцку шчыруюць,
Робяць цуды кожны дзень.
Госці здзіўленыя чуюць
Шапавальскі лемязень.

***Чытальнік 8: Лаўранкова Паліна***

Нашы еськаўцы не кажуць,
Што хаўбы – не грошы ў нас,
Не акрэсу – сала смажаць
З цёплай бульбачкай якраз.
Хаты ў вёсцы, як гасцёўні,
Гэта ўжо не навіна.

піша: "…Усё тое, што ідзе да нас ад продкаў, з тых крынічак-бліскавічак, якія іх паілі, будзе наталяць і нашу смагу. Спадчына, якую мы атрымалі ў народных абрадах, гэта наша годнасць, наша сіла, гэта мы самі: сапраўдныя, вясёлыя, жартаўлівыя:.."

Верш з кнігі Ніны Кавалёвай "Як купалі ў купелі", які распавядае пра справы землякоў чытаюць юныя краязнаўцы клуба "Спадчына", арганізаванага пры Цемналескай бібліятэцы-філіяле.

*Выступленне членаў клуба "Спадчына".*

**Як у Дрыбінскім раёне**

***Чытальнік 1: Жураўскі Ярамір***

А з нябёсаў песня льецца,
Трэба ж кожнаму адчуць:
Гэтак сонейка смяецца,
Гэтак птушачкі пяюць.
А над Проняй нешта дужа
Разляталіся буслы –
Старакожаўка з Прыбужжам
Ўжо падкручваюць вусы.
Ой, радзіначкі, радзіны,
Род бацькоў ідзе на "біс".
Перабольшваюць навіны
Драматург і гумарыст.

***Чытальнік 2: Шчарбакоў Ваня***

Пра Міхееўку як скажуць,
Дык аж слінкі пацякуць –
Тут і скварачку падсмажаць,
Тут і чарку паднясуць.
І наладзяць паляванні
Вам на вепраў, на ласёў.
Толькі б гэтыя старанні
Не згубілі тут усё.

***Чытальнік 3: Слаўнікава Арына***

А Нікольск і Кледнявічы
Ці паскардзяцца, ці не,
Што мастак і паляўнічы
Вёскі гэтыя міне.
Дык жа бачым: на раз'ездзе
Зранку тоўпіцца народ.
Па грыбы бягуць суседзі,
Як у той у "Еўраопт".

***Чытальнік 4: Палешчук Карына***

Ў Цёмным Лесе стала светла,
Толькі гэта перавес,
Бо "Скайфораст" вельмі ветла



вопыт у літаратурна-краязнаўчай рабоце бібліятэк Магілёўшчыны. Стварэнне і дзейнасць музейнага пакоя заўсёды падтрымліваюць кіраўнікі Дрыбінскага раёна, аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі і бібліятэчнай сеткі. Аб тым як выкарыстоўваюцца экспанаты музейнага пакоя і якое значэнне ён мае ў літаратурным жыцці краіны, вы даведаецеся з выступленняў удзельнікаў нашага мерапрыемства.

Сёння ў гэтай зале прысутнічаюць ганаровыя госці З Горацкага раёна:

____________________________________________________________

Дзякуй Вам, паважаны (ая)________________________________________

*7 СЛАЙД.*

***Вядучы 1:***

Ніна Дзмітрыеўна з 1986 году жыве ў горадзе Горкі Магілёўскай вобласці, але ніколі не забывае пра сваю малую радзіму. Паслухайце, калі ласка, некаторыя вершы, прысвечаныя роднай старонцы, ў выкананні артыстаў народнага ансамбля "Журавінка", які дзейнічае пры Цемналескім сельскім клубе.

*Выступленне народнага ансамбля "Журавінка"*

*Урывак з верша "Тёмный лес — моя любовь" Ніны Кавалёвай*

***1 чытальнік:***

Есть у каждого из нас
До конца не спетая
Песня сердца, песня глаз —
Самая заветная.

***2 чытальнік:***

Деревенька меж хлебов,
Тропками обвитая,
Тёмный Лес — моя любовь,
Сказка не забытая.

***3 чытальнік:***

І когда кипят сады,
І когда бушует вьюга,
Всех округ дороже ты,
Темнолесская округа.

*Песня "Темнолесский вальс" на словы і музыку Ніны Кавалёвай (пад баян)*

*Урывак з верша "Цемналескія зоры" Ніны Кавалёвай.*

***1 чытальнік:*** У нашым краі лугі мурожныя,
***2 чытальнік:*** У нашым краі лясы прыгожыя,
***3 чытальнік:*** А дзяўчаты у свеце лепшыя,
І ў працы, і ў песнях першыя…
***4 чытальнік:*** Лён высокі у росах беліцца,
***5 чытальнік:*** І дарога ўдалеч сцеліцца.
***6 чытальнік:*** Сустракаюць гасцей прыветныя,

Цемналескія зоры светлыя.
***7 чытальнік:*** Хай квітнеюць лугі мурожныя,
***8 чытальнік:*** Зелянеюць лясы прыгожыя.
***9 чытальнік:*** Наша праца, сяброўства шчырае,
Над старонкаю – неба мірнае.
*Песня "Вёсачка" на словы і музыку Ніны Кавалёвай (пад баян).*
***Вядучы 1:***
*Верш "Родны кут" з кнігі Ніны Кавалёвай "Голас вякоў".*
*(Чытаць з кнігі)*

**Родны кут**

Куток маленечкі радзімы,
Тут пралятаюць вёсны, зімы,
Тут у бацькоўскім у садку
Расту, нібы у церамку.

Тут на матулінай кашулі
Вятры узоры калыхнулі,
І засінелі васількі,
Зляцеўшы кропляй са шчакі.

Сяджу з духмянай лустай хлеба,
І больш нічога мне не трэба.
Ды не, хацела б тут я зноў
Жывымі стрэць сваіх бацькоў.

І зноў сястра ідзе праз мосцік,
За ёй Алёнка – матчын хвосцік.
А пад узмах бацькоўскіх рук
На зрубе весела "тук-тук".

***Вядучы 2:***
Родная вёсачка Еськаўка Цемналескай акругі займае асаблівае месца у сэрцы і творчасці паэтэсы. Аднойчы Ніна Дзмітрыеўна сказала: "…Няхай яна застанецца ў маёй памяці такой, якой я яе пакідала…"

Верш Ніны Кавалёвай "Адна вуліца ў Еськаўцы нашай" у выкананні вучаніцы 7 класа Святланы Ерафеевай

Адна вуліца ў Еськаўцы нашай
Тры хвіліны праехаць каню.
Што ні хата – спаткаеш тут свата,
Ці то кума, ці нават радню.
Кожны ведае ўсіх па імёнах,
Ад каго і чаго тут чакаць,
Па дабру ці па злу хто жадае,



Што у печы суседскай згадаць.
Цёмны лес у надзейным дазоры,
Поўны дум і сусветных трывог.
Адна вуліца ў Еськаўцы нашай.
Да яе – незлічона дарог.

***Вядучы 1:***
Дзякуючы вершам і песням Ніны Кавалёвай, пра маленькую вёсачку Еськаўка і ўвогуле Цемналескую акругу ведаюць нават за межамі нашай краіны.

*Верш Ніны Кавалёвай*
*"Цемналеская акруга"ў выкананні вучаніцы 8 класа Алёны Маліноўскай*

И когда кипят сады,
И когда бушует вьюга,
Всех округ дороже ты,
Темнолесская округа.
Каждый малый уголок
Интересней сказки книжки:
Ручеёк зовут Щенок,
А деревню Коротышки.
Коротышку гнал щенок.
Коротышка сбился с ног.
В голый лоб его набили.
И деревню добрый Бог
Гололобовкой нарёк,
Чтобы ближнего любили.
Ищет лучшего народ.
Кто томился на распутье
Обоснованно живёт,
Не покутуя, в Покутье.
На ловца беги, судьба –
Хлопцы делают облавы:
Разневестилась Верба,
Расфуфырились Шеблавы.
Пожелайте молодым
Обрести для счастья друга.
Домом будь и другом им,
Темнолесская округа.

***Вядучы 2***
У 2018 годзе пабачыў свет новы зборнік нашай знакамітай зямлячкі "Як купалі ў купелі", які стаў адразу каштоўным экспанатам музейнага пакоя. Значная частка гэтай унікальнай кнігі прысвечана гістарычнай і этнаграфічнай спадчыне Дрыбінскага краю. Фотаздымкі родных мясцін арганічна дапаўняюць змест выдання. У прадмове да кнігі Ніна Кавалёва